МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ
БРЭСЦКАГА АБЛВЫКАНКАМА
АДДЗЕЛ КУЛЬТУРЫ
ПРУЖАНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

**МУЗЕЙ-СЯДЗІБА**
**« ПРУЖАНСКІ ПАЛАЦЫК »**

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
УПРАВЛЕНИЕ КУЛЬТУРЫ
БРЕСТСКОГО ОБЛИСПОЛКОМА
ОТДЕЛ КУЛЬТУРЫ
ПРУЖАНСКОГО РАЙИСПОЛКОМА

**МУЗЕЙ-УСАДЬБА**
**« ПРУЖАНСКІ ПАЛАЦЫК »**

225133, Брэсцкая вобл., г.Пружаны, вул. Савецкая, 50, . Тэлефон: 7-18-96, факс: 9-15-45.
E-mail: palacyk@tut.by // www.museum.pruzhany.com

ПРЭС - РЭЛІЗ

# Брыфінг “Перспектыва развіцця музея-сядзібы “Пружанскі палацык””

18 мая 2008 года. Музей-сядзіба “Пружанскі палацык” правёў брыфінг “Перспектыва развіцця музея-сядзібы “Пружанскі палацык””. На нарадзе ўсім запрошаным зацікаўленым асобам быў прэзентаваны праект рэканструкцыі сядзібы распрацаваны творчым калектывам музея.

Праект прадугледжвае стварэнне **музейна-сядзібнага комплексу “Пружанскі палацык”**.

Рэалізацыя праекта уключае:

- узнаўленне і рэстаўрацыю парка;
- размяшчэнне на тэрыторыі парка інтэрпрэтацыі сядзібнага гаспадарчага двара ўзору XIX ст.(у пабудовах плануецца размесціць існуючую этнагарфічную экспазіцыю музея, музей Народнага майстра Рэспублікі Беларусь Мікалая Тарасюка, прадаставіць памяшканні для работы народных майстроў на цёплы перыяд году)
- перанос на новае месца і пабудова сучаснай Летняй эстрады;
- арганізацыя на тэрыторыі сядзібы разгорнутай турыстычнай інфраструктуры (кіёскі, кропкі харчавання, дзіцячая пляцоўка, карчма, гатэль, V.I.P.- катэджы.);
- стварэнне працоўнай групы па арганізацыі рэкламных PR-акцыяў, разпрацоўцы медыарэсурсаў, масавых тэатралізаваных мерапрыемстваў.

Вынік рэалізацыі праекта:

– актуалізацыя вывучэння і захавання грамадствам гістарычнай спадчыны.
– абнаўленне і удасканаленне рэкрэацыйнай зоны горада.
– развіццё музея ў музейна-сядзібны комплекс, як новай формы установы культуры, з мэтай выхаду музейнага дзела на новы ўзровень;
– уцягванне музея ў бізнес-працэсы, звязаныя з турызмам;
– стварэнне галоўнага турыстычнага аб’екта г.Пружаны, як асноўнага турыстычнага прыпынку ў памежжы Белавесскай пушчы;
– станаўленне г.Пружаны, як новага турыстычнага цэнтра ў рэгіене, які разам з Брэстам, Белавесскай пушчай зойме сваю нішу ў турыстычнай галіне Брэсцкай вобласці і які будзе здольным звярнуць на сабе ўвагу вялікай колькасці ня толькі беларускага, а замежнага турыста.

***Творчы калектыў музея-сядзібы “Пружанскі палацык”***